27 сакавіка 2024 | № 4 (301) | БрДУ імя А.С. Пушкіна

# БЕРАСЦЕЙСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

**Свята вясны, пяшчоты і хараства**
Рэктар Юрый Голубеў разважае пра важнасць свята 8 Сакавіка ў жыцці беларусаў
с. 2

**Вучыць новае пакаленне настаўнікаў**
Галіна Канцавая знаёміць з асноўнымі палажэннямі грыфаванага дапаможніка
с. 2

**Асветніца. Педагог. Настаўніца**
Зоя Мельнікава расказвае пра ролю прафесара Веры Зарэцкай у беларускай філалогіі
с. 3

## ВУЧЫЦЬ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ



**У 2023 годзе вучэбна-метадычнаму дапаможніку «Методыка развіцця маўлення малодшых школьнікаў», аўтарамі якога з'яўляюцца загадчык кафедры агульнаадукацыйных дысцыплін і методык іх выкладання кандыдат філалагічных навук, дацэнт Галіна Канцавая і Мікалай Сянкевіч, прысвоены грыф вучэбна-метадычнага аб'яднання па педагагічнай адукацыі.**

– Наш дапаможнік прызначаецца для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі, якія навучаюцца па спецыяльнасці 6-05-0112-02 "Пачатковая адукацыя", – адзначае Галіна Канцавая. – Ён будзе карысным у засваенні асноўных тэарэтычных палажэнняў дысцыпліны "Методыка развіцця маўлення".

Вучэбна-метадычны дапаможнік арыентаваны на фарміраванне ў будучых настаўнікаў пачатковых класаў усвядомленага выкарыстання сістэмы навукова абгрунтаваных метадычных аспектаў па навучанні развіццю маўлення малодшых школьнікаў у адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі адукацыйнага працэсу на першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі і ўзроставымі асаблівасцямі малодшых школьнікаў.

*(працяг на с. 2)*

СКАНИРУЙТЕ QR-КОД, ПЕРЕХОДИТЕ НА ОФИЦИАЛЬНЫЙ САЙТ БрГУ И УЗНАВАЙТЕ САМУЮ АКТУАЛЬНУЮ ИНФОРМАЦИЮ О ЖИЗНИ НАШЕГО УНИВЕРСИТЕТА.

t.me/brsu_pushkina
instagram.com/brsu_pushkina
vk.com/brsu_pushkina
vm.tiktok.com/ZMjf8eKNT/

**КАЛОНКА РЭКТАРА**

# Праздник ВНИМАНИЯ, ЗАБОТЫ И ТЕПЛА




В марте мы отмечаем самый нежный праздник – День женщин. В первые весенние дни на улицах встречаешь много мужчин с цветами для жен, мам, сестер и коллег. Социальные сети наполняются тысячами теплых слов с наилучшими пожеланиями для милых дам.

Праздник 8 Марта позволяет женщинам отвлечься от будничных забот, почувствовать легкость, поверить в исполнение желаний. В этот день все люди, не только представители прекрасной половины человечества, словно по-другому смотрят на мир – забывают о невзгодах и ненастьях, прощают друг другу обиды, обещают больше никогда не злиться и ссориться. Теплые слова и нежные объятия окрыляют на целый год вперед.

Дамы сами лучше знают, чего хотят. Да, наверное, не все мужчины умеют красиво говорить, не всегда угадывают с подарками, но, поверьте, мы заранее вспоминаем о важном женском празднике, долго думаем над тем, чем удивить любимых, и придумываем варианты воплощения наших задумок в реальность. Надеюсь, в этом году у нас всех получилось окружить вас, милые дамы, вниманием и заботой, порадовать созданием атмосферы тепла и уюта, подарить надежду и вселить веру в лучшее. И знайте: мы будем делать все возможное, чтобы так было не один день в году, а постоянно. В самые неожиданные моменты мы будем вырывать вас из бытовой рутины и устраивать для вас сюрпризы.

**С уважением,**
**ректор БрГУ**
**имени А.С. Пушкина**
**Ю.П. Голубев**



**НАВУКА**

*(пачатак на с. 1)*



# ВУЧЫЦЬ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ

Асаблівасцю вучэбнага выдання з'яўляецца яго практыкаарыентаванасць: выклад тэорыі ілюстраваны прыкладамі, канкрэтнымі практыкаваннямі, фрагментамі ўрокаў і інш. Кожны раздзел завяршаецца заданнямі для самастойнага выканання, многія з якіх праблемныя па сваім змесце, таму служаць асновай для ўзнікнення дыскусіі.

Маладыя людзі змогуць вырашаць адукацыйныя задачы, бачыць перспектывы маўленчага развіцця малодшых школьнікаў, падбіраць дыдактычны матэрыял да ўрокаў, праводзіць розныя віды пісьмовых творчых прац, аб'ектыўна ацэньваць веды, навыкі вучняў пачатковых класаў. Будучае пакаленне настаўнікаў падчас атрымання вышэйшай




адукацыі навучыцца прадугледжваць і вырашаць прафесійныя задачы ў галіне развіцця маўлення малодшых школьнікаў.

Аўтары спадзяюцца, што вучэбны дапаможнік "Методыка развіцця маўлення малодшых школьнікаў" паспрыяе ўдасканаленню разнастайных уменняў студэнтаў, фарміраванню ў іх метадычнага

**Запісала**
**Юлія Воўк**

**ПАДЗЕЯ**

# АСВЕТНІЦА. ПЕДАГОГ. НАСТАЎНІЦА

**У лістападзе 2023 года адзначыла свой прыгожы 90-гадовы юбілей прафесар, член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі (1995), заслужаны работнік вышэйшай школы, кавалер высакароднага медаля імя Францішка Скарыны Вера Якаўлеўна Ляшук-Зарэцкая. Яна была і застаецца гонарам Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна, установы, у якой вучылася, а затым і працавала больш за сорак гадоў.**



Асветніца. Педагог. Настаўніца. У самым поўным і высокім сэнсе гэтых слоў Вера Зарэцкая прадстаўляе кагорту тых людзей, якімі ганарыцца Берасцейшчына, якімі, несумненна, даражыць уся Беларусь. Па ўласным прызнанні, яна фарміравалася як педагог і вучоны пад уплывам “шасцідзясятніцтва”.

Педагагічна-адукацыйны вопыт, гуманітарны досвед метадыста і літаратуразнаўцы прафесара Веры Зарэцкай сёння не толькі шануецца, але і працягвае распрацоўвацца як на філалагічным факультэце нашай ВНУ, так і ў многіх школах Берасцейшчыны і Беларусі. Ва ўніверсітэце яна стварыла адну з найлепшых беларускіх навукова-педагагічных школ, якая з гонарам перамагала і перамагае ў дзяржаўных конкурсах па распрацоўцы падручнікаў па роднай літаратуры для агульнаадукацыйных устаноў Рэспублікі Беларусь.

Многія кнігі, манаграфіі, падручнікі для школы і ВНУ, шматлікія публікацыі Веры Якаўлеўны па гісторыі і методыцы выкладання літаратуры, літаратурна-краязнаўчай праблематыцы, навукова-гуманістычнай інтэрпрэтацыі беларускай класікі і сучаснага літаратурнага працэсу, па літаратуры Берасцейшчыны былі, застаюцца і заўсёды будуць запатрабаванымі. Яны з’яўляюцца найлепшымі вучэбнымі кнігамі, багатым і ўдзячным набыткам кожнага, нават самага вопытнага настаўніка-гуманітарыя і тым больш кожнага студэнта, вучня, чалавека, які даражыць нацыянальна-духоўнай спадчынай Бацькаўшчыны. Старонкі літаральна кожнай публікацыі Веры Якаўлеўны – сведчанне яе вялікага прафесійнага досведу, дасканалага ведання гісторыі, культуры, літаратуры.

Вера Зарэцкая пераканана, што грамадзянін і патрыёт пачынаецца з любові да малой радзімы, з шанавання гістарычнай памяці і традыцый сваёй сям’і, зямлі, роду, з народазнаўчых ведаў. Да аўтарытэтнага меркавання берасцейскай асветніцы далучыліся вучоныя, метадысты іншых ВНУ і рэгіёнаў Беларусі, прыслухаліся і кіраўнікі сістэмы адукацыі нашай краіны. З 90-х гадоў краязнаўчы кампанент заняў належнае месца ў сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў-гуманітарыяў, а таксама на ўроках роднай літаратуры ў школах. Вера Якаўлеўна пры падтрымцы кіраўніцтва ўніверсітэта адкрыла кафедру методыкі выкладання беларускай літаратуры і краязнаўства. Разам са сваімі калегамі з натхненнем, руплівa распрацоўвала берасцейскае краязнаўства, заахвочваючы да гэтай працы настаўнікаў рэгіёна і студэнтаў.

Менавіта з клопатам пра будучыню вучыла і выхоўвала, адпраўляла ў настаўніцкі шлях, на слугаванне Бацькаўшчыне маладых спецыялістаў-філолагаў. Яна і потым не пераставала апекаваць сваіх выпускнікоў, цікавіцца іх прафесійным і асабістым лёсам. І яны, ужо сталымі, не саромеліся звяртацца па парады да Настаўніцы, як арганізаваць краязнаўчы музей у школе, пазакласную ці пазашкольную выхаваўчую працу.

Многія вучні прафесара Веры Якаўлеўны сталі вядомымі людзьмі: навукоўцамі, метадыстамі, прызнанымі педагогамі, добрымі кіраўнікамі розных узроўняў і рангаў нашай вобласці і Беларусі. І сёння яны з глыбокім шанаваннем шлюць словы ўдзячнасці сваёй зычлівай Настаўніцы, вопытнаму старэйшаму сябру.



*Вера Зарэцкая трэцяя злева ў ніжнім радзе*

**Зоя Мельнікава, прафесар кафедры беларускай філалогіі**

НАВІНЫ

# Насыщенный событиями МАРТ

### ЗА ОПЫТОМ – В СОЧИ

Сотрудники и студенты БрГУ приняли участие во Всемирном молодежном фестивале молодежи и студентов в Сочи. Поэтому они на протяжении недели вместе с другими участниками из 180 стран мира занимались наукой, общались с политиками, звездами кино, театра. В фокусе внимания молодых людей также были темы экономики, трудоустройства, бедности. Национальный колорит всех стран-участниц отразило костюмированное шествие.

Студентов впечатлила организация масштабного форума, режиссура концертов, атмосфера единения и дружбы, концентрация на одной территории тысяч умных и талантливых молодых людей, готовых делиться опытом и созидать.

С фестивального побережья молодежь БрГУ увезла новые знакомства, задумки и яркие впечатления. Она заявила о себе и своей стране всему миру и вернулась, чтобы с новыми силами менять альма-матер и Беларусь к лучшему.

**Юлия Вовк**

### ПОДГОТОВКА КАДРОВ

БрГУ имени А.С. Пушкина стал площадкой для проведения круглого стола «Подготовка педагогических кадров для системы общего среднего образования Брестской области» с участием начальника главного управления по образованию Брестского облисполкома Натальи Калиновской.

На мероприятии отмечено, что сейчас в сфере образования остро стоят три вопроса – нехватка педагогических кадров, формирование контрольных цифр приема в учреждениях послешкольного образования и закрепляемость молодых специалистов на рабочих местах. Главный посыл прошедшего круглого стола – подготовка кадров для экономики и социальной сферы.

**Юлия Вовк**



*Всемирный фестиваль молодежи и студентов в Сочи*

### ВНЕШНЕЕ ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ

Институт Конфуция БрГУ и Брестская областная библиотека имени Максима Горького организовали Дни китайской культуры и литературы в Бресте. В торжественном открытии мероприятия приняли участие сотрудники Института, преподаватели и студенты филологического факультета.

Насыщенная программа первого дня включала приветствия представителей всех организаций – партнеров мероприятия, знакомство с серией книг «Светлыя знакі: паэты Кітая», презентацию книжных выставок и литературные чтения китайской поэзии в переводе на русский язык.

**Институт Конфуция**

### ПРИЗНАНИЕ

6 марта в рамках проведения XXXVII конференции Брестской городской организации ОО «БРСМ» БрГУ имени А.С. Пушкина и его молодежный актив отмечены благодарностью Брестского городского исполнительного комитета за значительный вклад в реализацию проектов БРСМ в 2023 году. Такой же награды удостоены студентка факультета иностранных языков Варвара Колупанович и обучающийся физико-математического факультета Кирилл Бут-Гусаим.

**https://t.me/brsu_pushkina**

### У ФОКУСЕ НАВУКІ – ПЫТАННІ ФІЛАЛОГІІ

5 сакавіка на філалагічным факультэце адбылася Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў «Берасцейскія карані: гісторыя, літаратура, культура краю і сучаснасць», прысвечаная 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У ёй прынялі ўдзел прадстаўнікі вышэйшых навучальных устаноў Брэста, Гродна, Віцебска, Мінска. У дакладах разглядаліся пытанні літаратуры, гісторыі, краязнаўства, фальклору, моўных адметнасцей Берасцейшчыны як складнікаў сучаснай адукацыйна-выхаваўчай парадыгмы.

**Філалагічны факультэт**

**«Берасцейскі ўніверсітэт» № 4 (301) сакавік 2024 г.**

**Рэдакцыя:**
рэдактар – Ю.Б. Мошчык, тэл. 21-65-64.
Фота – В.У. Швядоўская, У.С. Хрыстафораў.
Куратар газеты – С.С. Клундук.
Газета падрыхтавана на настольнай выдавецкай сістэме РВА БрДУ імя А.С. Пушкіна,
224016, г. Брэст, бульвар Касманаўтаў, 21.

Надрукавана на рызографе БрДУ імя А.С. Пушкіна.
224016, г. Брэст, вул. Міцкевіча, 28.
E-mail: media@brsu.by.
Падпісана ў друк 27.03.2024.
Аб'ём – 1,0 ум. друк. арк.
Тыраж – 65 экз. Заказ № 72.
ЛП № 02330/454 ад 30.12.2013.